# ПА ЗАПАВЕТАХ СВЯТЫХ КІРЫЛЫ І МЯФОДЗІЯ

**Сёлета чарговыя IV Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні ў Мінску сталі спробай аб'яднання агульных намаганняў дзвюх навучальных устаноў — Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта (ЕГУ) і Беларускага універсітэта культуры (БУК) — у святкаванні і правядзенні Дзён славянскага пісьменства і культуры. Аргкамітэт Беларускага універсітэта культуры па правядзенню Чытанняў звярнуўся на тэалагічны факультэт ЕГУ з прапановай аб сумеснай арганізацыі Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, якія сталі традыцыйнымі для абедзвюх устаноў. Вялікую падтрымку ў арганізацыі IV Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў аказаў непасрэдна Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усёй Беларусі, дэкан факультэта тэалогіі ЕГУ.**



Пленарнае пасяджэнне. 25 мая 1998 г. Бібліятэка БУКа.

Пленарнае пасяджэнне, якому папярэднічаў святочны малебен, пачалося на факультэце тэалогіі ЕГУ 24 і працягвалася 25 мая ў чытальнай зале бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры. На святочнае адкрыццё Чытанняў былі запрошаны прадстаўнікі пасольстваў Балгарыі, Грэцыі, Югаславіі і Расіі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама супрацоўнікі Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры Беларусі. Прысутнасць Мітрапаліта Філарэта, яго выступленні ў першы і другі дзень сталі неабходным звязуючым, яднаючым звяном у агульнай справе.

Шчыра віталі ўдзельнікаў IV Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў рэктар БУК Я.Д.Грыгаровіч, прарэктар па навуковай рабоце А.У.Пазднякоў, фальклорны ансамбль "Грамніцы" пад кіраўніцтвам У.Зяневіча, ды і наогул усе выкладчыкі і студэнты універсітэта. БУК наведалі навукоўцы не толькі з розных месц Беларусі, але і з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Рыма.

На працягу чытанняў працавала сем тэматычных секцый, у якіх удзельнічала больш за 100 чалавек. Найбольш напоўненай і насычанай была секцыя "Кірыла-Мяфодзіеўскія традыцыі ў духоўнай і кніжнай культуры славянскіх народаў". Упершыню былі арганізаваны і працавалі ў БУК такія секцыі, як "Духоўная музыка ў славянскай культуры", "Архітэктура і выяўленчае мастацтва ў культурнай спадчыне славян", у ЕГУ — "Багаслоўская і рэлігіязнаўчая адукацыя ў сучасным грамадстве", "Праблемы багаслоўскіх і царкоўна-гістарычных даследаванняў".

У традыцыйных Студэнцкіх Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях (якія, дарэчы, і сталі пачынальнікам Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў) удзельнічалі на гэты раз не толькі студэнты тэалагічнага факультэта ЕГУ, але і студэнты факультэта культуралогіі і факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм БУК.

На тэалагічным факультэце ЕГУ быў праведзены "круглы стол" на тэму "Праваслаўе і культура ў сучасным свеце". Актыўным удзелам вызначыліся навукоўцы з Расійскай акадэміі навук — прафесар А.Б.Зубаў і прафесар У.М.Катасонаў; з Санкт-Пецярбургскай Духоўнай акадэміі — выкладчык В.П.Хаўронічаў; з Італіі — прафесар Андрыана Раккуччы, а таксама выкладчыкі і студэнты факультэта тэалогіі ЕГУ і Беларускага універсітэта культуры.

На працягу чытанняў у ЕГУ і БУК працавалі выставы кніг сучасных выданняў багаслоўскай і рэлігійна-філасофскай тэматыкі, а таксама кірылічных рукапісаў і выданняў XVI—XVIII стагоддзяў з кнігазбораў аддзела рэдкай кнігі Прэзідэнцкай бібліятэкі, Бібліятэкі Мінскага Епархіяльнага Упраўлення, аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры. Так, напрыклад, калекцыю кірылічных кніг Прэзідэнцкай бібліятэкі прадстаўлялі творы Іаана Максімовіча, Лявонція Магніцкага, Феафана Пракаповіча, Сімяона Полацкага, якія былі надрукаваны ў Кіеве, Львове, Маскве, Чарнігаве, Гале. Асаблівасцю калекцыі кірыліцы з Бібліятэкі Мінскага Епархіяльнага Упраўлення сталі рукапісны "Месяцаслоў" і "Евангелле", а таксама віленскае выданне Святатроіцкага манастыра "Альфа і амега" (1786) і магілёўскі "Часоўнік" (1713).

Адметны нацыянальны каларыт у афармленне памяшканняў, у якіх праходзілі Чытанні, унеслі вырабы кафедры народных рамёстваў БУК: кераміка Т.І.Васюк, габелены А.І.Непачаловіч. Спецыяльна да чытанняў Т.І.Васюк і яе студэнтамі былі падрыхтаваны памятныя медалі з выявай Жыровіцкай Божай Маці.

Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні — гэта магчымасць размовы аб старабеларускай кніжнасці ў кантэксце развіцця славянскіх культур, аб іх уплывах і ўзаемасувязях, асаблівасцях і адзінстве. Сёлета ў працы секцыі "Кірыла-Мяфодзіеўскія традыцыі ў духоўнай і кніжнай культуры славянскіх народаў" бралі ўдзел болей дваццаці, у асноўным, маладых даследчыкаў кніжнай спадчыны. На працягу двух дзён, 25 і 26 мая, секцыйнае пасяджэнне тактоўна і мудра вяла Алена Яскевіч, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я.Купалы НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Цікавымі і змястоўнымі, як заўсёды, былі выступленні нязменных удзельнікаў Чытанняў супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі і Бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Жыція Кірылы і Мяфодзія.

навук Беларусі. Так, Алена Цітавец, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі, расказала пра беларускія вучэбныя кнігі XVI — XVIII стагоддзяў з калекцыі кірылічных выданняў Акадэмічнай бібліятэкі, пра асаблівасці і каштоўнасці кожнага твора, вызначыла іх значэнне для Беларусі.

Супрацоўнікі аддзела рукапісаў, рэдкіх кніг і стaрадрукаў НББ на гэты раз звярнуліся да больш позніх часоў у кніжнай культуры славянскіх народаў — XVIII—XIX стагоддзяў. Са збораў Нацыянальнай бібліятэкі былі прадстаўлены выданні пятроўскіх часоў (Наталля Раманава) і адзін стараверскі зборнік XIX ст. (Людміла Станкевіч).

Адным з захапляючых стала на секцыі выступленне Ірыны Масляніцынай пра даследаванні "Велесавай кнігі" — старажытных славянскіх тэкстаў на драўляных дошчачках прыкладна IX стагоддзя, след якіх знайшоўся падчас грамадзянскай вайны, але, на вялікі жаль, зараз ізноў застаецца згубленым і невядомым.

Выстава рукапісных і старадрукаваных кніг.




ЛАРЫСА ДОЎНАР

Па тэматыцы першынство было аддадзена выступленням, прысвечаным старабеларускай кніжнай і духоўнай культуры. Гэта даклады маладых навукоўцаў з Беларускага дзяржаўнага універсітэта кандыдатаў філалагічных навук Алены Сурковай і Алы Кожынавай "Тэксталагічныя рэмінісцэнцыі ў помніках Кірыла-Мяфодзіеўскага корпуса"; ксяндза Славаміра Ляскоўскага, настаяцеля Гомельскага касцёла Непарочнага Зачацця Дзевы Марыі, і Віктара Адзіночанка, дацэнта кафедры культуралогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, кандыдата філасофскіх навук "Кірыл і Мяфодзій у каталіцкай традыцыі". Звярнуліся даследчыкі і да спадчыны вядомых беларускіх асветнікаў Ефрасінні Полацкай (Аляксей Парэцкі, бібліёграф Прэзідэнцкай бібліятэкі) і Францыска Скарыны (Ігар Клімаў, кандыдат філалагічных навук з Беларускага дзяржаўнага універсітэта).

Быццам у пацвярджэнне слоў Алены Яскевіч, што менавіта ў сённяшняй рэальнасці не плоць, а дух патрабуе ацалення, сталі выступленні Ульяны Шаставец, Паўла Баянкова, Іраіды Уржынскай, Тамары Самайлюк і Таццяны Дзем'яновіч. Алена Яскевіч у сваім дакладзе зрабіла высновы, што падзеі рэлігійна-дзяржаўных катаклізмаў XVII стагоддзя абудзілі развіццё як іканапісу, так і марыялагічнай кніжнасці на землях Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Супрацоўнікі аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі БУК Тамара Самайлюк і Таццяна Дзем'яновіч прадставілі свой першы вопыт складання біябібліяграфічнага даведніка, прысвечанага іерарху Беларускай Праваслаўнай Царквы Мітрапаліту Філарэту.

У выступленнях закраналіся некаторыя аспекты кніжнай культуры Мінска XIX — пачатку XX ст. (Ларыса Доўнар, супрацоўніца аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі БУК), разглядалася дзейнасць Пецярбургскіх таварыстваў па выданню беларускай вучэбнай кнігі (Тамара Чаплыгіна, старшы выкладчык кафедры бібліятэказнаўства БУК). У якасці прыкладу крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі аб Беларусі Валянцінай Саітавай, дацэнтам кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства, кандыдатам педагагічных навук, быў прадстаўлены часопіс "Ateneum Wileński".

Такім чынам, праца секцыі стала яшчэ адным сведчаннем актывізацыі ў апошнія часы на Беларусі распрацоўкі кнігазнаўчай тэматыкі. Традыцыі, закладзеныя ў свой час такімі выданнямі, як навуковыя зборнікі ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі па гісторыі кнігі, кнігазнаўству, бібліятэчнай справе і бібліяграфіі ў Беларусі (1970 — 1993), а таксама альманахам "Свіцязь" (1989), зараз знайшлі працяг у выданнях НББ "Вяртанне", "Здабыткі", у часопісе "Бібліятэчны свет", на навуковых канферэнцыях, дзе адно з асноўных месц займала гісторыя кнігі Беларусі — "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць" (1996), "III Скарынаўскія чытанні" (1997), "Бібліятэка ў сучаснай інфармацыйнай прасторы"(1997) і г.д.

Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні таксама спрабуюць папоўніць плынь беларускай кніжнасці і духоўнасці, даюць магчымасць асэнсавання кніжнасці ў духоўным сусвеце чалавека. Арганізатары Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў выказваюць надзею на замацаванне і развіццё традыцыі штогадовага вясновага правядзення мерапрыемства, прысвечанага славянскаму пісьменству і культуры і, вядома, запрашаюць да пашырэння кола новых удзельнікаў, дзякуюць усім сваім сталым сябрам і аднадумцам.

Summary

On May 24 — 25, 1998 IV Cyrill-Mefodij readings were carried out on the basis of European Humanitarian University and Belarussian University of Culture. More than 100 persons have taken part in work of 7 thematic sections.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ